Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Грыцкавіцкі навучальна – педагагічны комплекс
дзіцячы сад – сярэдняя школа”

# Вось мая веска

(канспект занятку па адукацыйнай вобласці выяўленчае мастацтва:
маляванне ў 1 рознаўзроставай групе)

Грышчанка Наталія Вікенцьеўна
вышэйшая адукацыя
1 кваліфікацыйная катэгорыя

Праграмныя задачы: фарміраваць уменне дзяцей перадаваць разнастайнасць дамоў: высокіх і доўгіх, нізкіх і вузкіх, аднапавярховых; развіваць дробную маторыку, вобразнае мысленне.

Выхоўваць эстэтычныя пачуцці

Папярэдняя праца: Разгляданне фатаграфій, ілюстрацый, паштовак з выявай дамоў рознага выгляду, гутарка на тэму: “У якім доме ты жывеш?», чытанне прыказак і прымавак, вершаў пра вёску.

Дэманстрацыйны матэрыял: ілюстрацыі вясковых хатак, сельскіх вуліц, макет аднапавярховага дома.

Раздатачны матэрыял: альбомныя лісты, графітныя алоўкі, воскавыя крэйды.

Ход занятку

Паслухайце верш: “Мой край"

Мая зямля, мой родны дом
Завецца Беларуссю.
Я знаю: пад тваім крылом
Заўсёды прытулюся.
У час трывогі і бяды
З табою мы адзіныя,
З любоўю шчыраю заўжды
Заву цябе Радзімаю. (Валерыя Бароўская)

Як называецца наша Радзіма?

У нашай краіне шмат гарадоў, пасёлкаў, аграгарадкоў, вёсак. У якой весцы ты жывеш?

Як выглядае вясковая вуліца? Якія там дома? (нізкія, аднапавярховыя, драўляныя, цагляныя)

А ці ёсць у нашым аграгарадку домы, якія складаюцца з двух паверхаў?

Мы з вамі сёння пабудуем вясковыя аднапавярховыя дамы на вуліцы вёскі, гэта значыць намалюем.

2. Разглядаем макет дома.

На якія геаметрычныя фігуры падобныя дэталі дома? (квадрат або прамавугольнік-сцены, трохвугольнік-дах, дзверы падобная на прамавугольнік, вокны квадратнай формы)

Якія яшчэ дэталі дома мы не назвалі, але яны прысутнічаюць? (ганак і труба)

А навошта труба ў доме? (калі паляць печку, каб зімой сагрэць дом, дым па трубе выходзіць на вуліцу). Паглядзіце, як дом намалюю я.

3. Паказ выхавальніка.

У выніку атрымліваецца вось такі просты домік, які трэба толькі размаляваць! А ў двары дома заўсёды расце вялікая разгалістае дрэва:

спачатку намалюем ствол, а затым  галінкі і лісце. Па жаданні можна дапоўніць кампазіцыю траўкай, кветкамі, сонейкам.

Перш чым пачаць маляваць, давайце разамнем нашы пальчыкі.

Пальчыкавая гімнастыка “Дом”.

На палянцы стаіць дом, (Паказваюць далонямі домік.)

І да дома мы ідзём. (Рукамі робяць браму.)

Там браму адчыняем, (Пальцы сціскаюць у кулак, выконваюць павароты ўлева-ўправа.)

Усіх у госці запрашаем! (Выконваюць рукамі запрашаючыя рухі.)

Раскажыце, што ў вас на сталах? (альбомныя лісты, воскавыя крэйды і графітныя алоўкі). Што вы будзеце маляваць? (Адказы дзяцей)

Можаце прыступаць да малявання.

4. Самастойная дзейнасць дзяцей.

5. Рэфлексія.

Рабяты, паглядзіцеякія прыгожыя даміы у нас атрымаліся, якую вуліцу мы забудавалі. Усе вы вялікія малайцы. Ягор, чый малюнак табе спадабаўся. Вы ўсе сёння пастараліся, і вясковая вуліца выглядае прыгожай, яркай і прыгожай!

6. Афармленне выставы малюнкаў.